# § 20. Медыякультура сучаснага грамадства

## Медыя адлюстроўваюць рэальнасць або канструююць сваю?



Мы — спажыўцы медыя?

- Хто стварыў гэтае паведамленне?
- Пра што гэтае паведамленне?
- Як перададзена гэтае паведамленне?

Мы — стваральнікі медыя?



Эмоцыі Фэйкі Аўдыторыя Інфармацыя Факты



Інфармацыі мала?

- Для каго гэтае паведамленне?
- Навошта створана гэтае паведамленне?

Інфармацыі шмат?



**Медыятэкст ≠ меседж**

| Кнігі, газеты, часопісы | Радыё | Кінематограф, тэлебачанне | Камп'ютары, інтэрнэт | Сацыяльныя сеткі |
|---|---|---|---|---|

Старыя → Медыя → Новыя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце медыя і медыякультуры.** *Медыя* — гэта сукупнасць інфармацыйных сродкаў і спосабаў, што служаць для перадачы канкрэтнай аўдыторыі паведамлення ў той ці іншай форме (друкаванае слова, музычная кампазіцыя, радыёперадача, фільм і да т. п.). Да медыя адносяцца прэса, радыё, кінематограф, камп’ютарныя гульні, тэлебачанне, інтэрнэт і інш.

Адным з першых тэрмін *media* (медыя ў шырокім сэнсе азначае «пасрэднік») для абазначэння сродкаў перадачы і распаўсюджвання інфармацыі выкарыстаў канадскі даследчык Маршал Маклюэн. У сваёй кнізе «Разуменне медыя: знешнія пашырэнні чалавека» (1964 г.) вучоны сцвярджаў, што сучасныя медыя літаральна пашыраюць слых, зрок і дотык і прапануюць новыя магчымасці для звычайнага чалавека, дазваляючы яму імгненна быць паўсюль. ■

Са з’яўленнем новых тэхнічных магчымасцей кожны наступны прадстаўнік медыя дапаўняе магчымасці папярэдніх. Раней сродкам перадачы інфармацыі з’яўляліся кнігі, газеты і часопісы, якія даносілі да чытачоў тэкст і статычны малюнак. Радыё дадало гук. Кіно і тэлебачанне злучыла дынамічны малюнак, тэкст і гук.



Дэтэктыў Камедыя Мюзікл Фантастыка

Прыгадайце, якая падзея лічыцца пачаткам кінематографа. Як называецца першы беларускі фільм? Калі ён быў створаны? У якім жанры? Назавіце вядомыя вам кінажанры, акрамя пералічаных на ілюстрацыі. ■

Як у фільмах розных жанраў «працуюць» малюнак, рух, гук, колер? Якія фільмы вы любіце глядзець і чаму? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Інтэрнэт стаў універсальнай платформай, дзе могуць існаваць, відазмяняцца і развівацца ўсе медыя. Галоўнае, што інтэрнэт прыўнёс у медыя, — гэта гіпертэкст, які звязвае розныя матэрыялы паміж сабой і дае нам магчымасць узаемадзейнічаць з імі, уплываючы на тое, што мы чуем, бачым ці чытаем.

Прадуктам медыя з'яўляюцца *медыятэксты* — паведамленні, тэксты, створаныя ў розных відах і жанрах медыя (напрыклад, рэпартаж па тэлебачанні, анлайн-трансляцыя, газетны артыкул, пост у блогу, дакументальны, мастацкі фільмы).

## Уласцівасці медыятэксту

| | |
|---|---|
| **Наяўнасць меседжу (галоўнай ідэі, пасылу)** | Кожны медыятэкст утрымлівае пэўнае пасланне, нясе галоўную ідэю, пасыл, які закладваюць яго стваральнікі. Напрыклад, рэклама мае мэту не павесяліць або адукаваць нас, а прадаць тавар ці паслугу, таму яе галоўная ідэя — «купляй» |
| **Множнасць культурных кодаў** | У любым медыятэксце ўтрымліваецца мноства кодаў. Напрыклад, для таго каб разумець кінатэксты, неабходна ведаць мову кіно — як у фільме «працуе» кадр, ракурс, план, гук, колер |
| **Медыйнасць** | Спосаб стварэння медыятэксту вызначаецца асаблівасцю канала перадачы інфармацыі (друк, радыё, тэлебачанне, інтэрнэт). Напрыклад, газеты будуць выкарыстоўваць пісьмовую мову, шрыфты і ілюстрацыі, радыё — голас, тэлебачанне — відэарад, інтэрнэт — усё разам |
| **Публічнасць і масавасць** | Прыватнае паведамленне становіцца медыятэкстам, як толькі яно апублікавана. Медыя амаль імгненна дастаўляюць інфармацыю ў любы пункт свету. Адрасатам медыя з'яўляецца мэтавая аўдыторыя |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Мы павінны разумець, што медыя забяспечваюць комплекснае бачанне свету, якое ўключае псіхалагічныя, маральныя, эстэтычныя і палітычныя аспекты. Пры гэтым атрыманае намі з медыя ўяўленне пра свет і сапраўдны свет могуць не супадаць, а значыць, медыя ствараюць даволі жывую ілюзію, асаблівы свет. Таму, узаемадзейнічаючы з любым медыятэкстам, чалавек павінен задаваць сабе наступныя пытанні:

- Хто стварыў гэты медыятэкст?
- З якой мэтай?
- Якім чынам?
- Для каго?
- Хто можа атрымаць ад гэтага медыятэксту карысць?
- Каму ён можа нашкодзіць?
- Пра што не гаворыцца ў гэтым медыятэксце, а трэба было б ведаць?



Медыя выконваюць ролю пасрэдніка, які фарміруе ў чалавека сістэму ацэначных меркаванняў, жыццёвую пазіцыю, стварае грамадскую думку.

**Асаблівасці медыякультуры.** Пастаяннае ўзаемадзеянне з медыятэкстам, без якога не існуе сучаснай культуры, спарадзіла асаблівы від культуры — медыякультуру.

**Медыякультура** — культура вытворчасці, перадачы і ўспрымання інфармацыі, чытання, аналізу, ацэнкі і стварэння медыятэксту, медыятворчасці. Дзякуючы інтэнсіўнаму развіццю інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, з'яўленню мабільных тэлефонаў і іншых гаджэтаў усе мы сёння з'яўляемся не толькі спажыўцамі, але і стваральнікамі мэдыякантэнту.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Узровень медыякультуры асобы і грамадства вызначаецца наступнымі ведамі і ўменнямі:

**Я — медыя**

| Спажывец | Стваральнік |
| --- | --- |
| • Ведаю, што такое інфармацыя і медыя<br>• Умею шукаць інфармацыю і правяраць яе дакладнасць<br>• Умею крытычна ацэньваць кантэнт<br>• Умею бяспечна выкарыстоўваць і распаўсюджваць інфармацыю з захаваннем маральных і прававых нормаў | • Ведаю, што такое інфармацыя і медыя<br>• Умею апрацоўваць інфармацыю з дапамогай розных тэхналогій<br>• Умею ствараць і распаўсюджваць медыятэксты з захаваннем маральных і прававых нормаў |

Мы жывём у вельмі насычаным інфармацыяй асяроддзі. За месяц сучасныя медыя выпрацоўваюць столькі інфармацыі, колькі чалавек XVII ст. не атрымліваў за ўсё жыццё. Калі ў XX ст. інфармацыя яшчэ з'яўлялася каштоўнасцю і яе неабходна было ўмець здабываць, то ў XXI ст. у першую чаргу неабходна ўмець фільтраваць і ставіць бар'еры для залішняй інфармацыі і фэйкаў (ілжывай інфармацыі). Павелічэнне аб'ёмаў інфармацыі прывяло да страты даверу да яе. Гэта звязана з тым, што ў сацыяльных сетках адсутнічае ўласцівая друкаваным выданням праверка інфармацыі на дакладнасць. У выніку дакладная інфармацыя і фэйкі стаяць у адным шэрагу і паміж імі цяжка знайсці адрозненні.

Для таго каб бяспечна выкарыстоўваць і адказна ствараць уласны кантэнт, неабходна ведаць асноўныя стандарты яго якасці:

- паўната і дакладнасць перадачы інфармацыі;
- аператыўнасць;
- аддзяленне фактаў ад меркаванняў і каментарыяў;
- збалансаванасць (падаюцца розныя пункты гледжання);
- абавязковая спасылка на крыніцу інфармацыі.

**Уплыў медыя на культуру асобы і грамадства.** У сучасным грамадстве медыя адыгрываюць велізарную ролю. Дзякуючы новым



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

медыя (інтэрнэт, сацыяльныя сеткі) мы патэнцыйна валодаем усёй назапашанай чалавецтвам інфармацыяй. Аднак, як мы ўжо заўважалі, медыя не падаюць нейтральнай інфармацыі. Нават тыя рэсурсы, што створаны як даведачныя і пазбягаюць ацэначных меркаванняў, вельмі часта рэдагуюцца звонку для выкарыстання з рознымі мэтамі.

**Ці можна выкарыстоўваць Вікіпедыю ў якасці адзінай крыніцы інфармацыі?**



Вікіпедыя ствараецца добраахвотнікамі з усяго свету больш чым на трохстах мовах. Свабодная энцыклапедыя ўваходзіць у пяцёрку самых папулярных вэб-сайтаў у свеце, але з самога свайго заснавання ў 2001 г. з’яўляецца аб’ектам крытыкі. Прычына ў тым, што практычна кожны чалавек можа зрабіць свой уклад у стварэнне яе артыкулаў.

Плюсам ці мінусам з’яўляецца захаванне Вікіпедыяй інфармацыі пра ўсіх аўтараў, якія ўнасілі змены ў артыкулы?

Ці адрозніваюцца артыкулы пра адну падзею ці асобу на розных мовах? Чаму? ■

Мы шукаем аб’ектыўную інфармацыю, а знаходзім прыхаваную камерцыйную або палітычную рэкламу. У залежнасці ад таго, на які інтэрнэт-рэсурс мы заходзім, мы трапляем пад уплыў уладальнікаў гэтага рэсурсу. Ствараючы для сябе стужку навін, мы выбіраем тыя інфармацыйныя рэсурсы, якія даюць нам чаканую карціну падзей. Гаворка ідзе пра тое, што пры дапамозе медыя мы ствараем сабе свет, у якім будзем адчуваць сябе камфортна, мала клапоцячыся пра аб’ектыўнасць інфармацыі ў гэтым штучным свеце.

Паколькі сучасны чалавек праводзіць вельмі шмат часу ў медыяпрасторы, яна становіцца для яго крыніцай ведаў. Медыя шмат у чым фарміруюць карціну свету, вызначаюць прадметы грамадскіх дыскусій, навязваюць спосабы вырашэння праблем.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне





Якія кірункі развіцця медыя паказаны ў дадзеных медыятэкстах? Што аб'ядноўвае гэтыя медыятэксты? Чым адрозніваюцца іх меседжы?

**Разам з тым медыя становяцца пасрэднікам паміж рознымі арганізацыямі і грамадствам. Ухваленне або незадавальненне масавай аўдыторыі карэкціруе дзейнасць як асобных людзей, так і арганізацый і дзяржаў.**

**Такім чынам, мы можам сказаць, што роля медыя ў сучаснай культуры выключна вялікая. Яны, фарміруючы вобраз сучаснага свету, могуць стацца як крыніцай росту нянавісці і агрэсіі, так і фактарам удасканалення чалавечага грамадства, служыць крыніцай і механізмам паспяховага міжкультурнага ўзаемадзеяння.**

1. Пералічыце вядомыя вам медыя. Якія з іх можна аднесці да старых медыя, а якія да новых?
2. Назавіце тры прыёмы, з дапамогай якіх можна праверыць дакладнасць інфармацыі ў медыя. Праверце сябе з дапамогай памяткі.
3. Ахарактарызуйце спосабы ўплыву медыя на культуру асобы і грамадства. Прывядзіце прыклады на аснове аналізу актуальнага медыятэксту.

Выканайце міні-праект «Героі серыялаў». Правядзіце апытанне сярод аднагодкаў, сваіх бацькоў і прадстаўнікоў больш старэйшага пакалення і даведайцеся, якія серыялы і чаму яны глядзяць. Хто з'яўляецца героем і антыгероем у серыяле?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне